**Святлана БЕРАСЦЕНЬ,**
**фота Валерыя Харчанкі**

# Рытмы замкаў ды сядзіб

**Вернісажы мастакоў і прэзентацыі выдавецкіх праектаў на выставачнай прасторы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі звычайна ладзяцца ў музычным атачэнні. Але гэтым разам гераінай імпрэзы была ўласна музыка: у галерэі "Лабірынт" адбылася канцэрт-прэзентацыя серыі нотных выданняў "Музычная спадчына Рэчы Паспалітай з Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі", арганізаваны НББ і выдавецтвам "Чатыры чвэрці".**



Праект міжнародны — ажыццёўлены супольна Расійскай Нацыянальнай бібліятэкай, Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, выдавецтвам "Чатыры чвэрці" пры фінансавай падтрымцы Польскага інстытута ў Санкт-Пецярбургу. Выхаду ў свет выкшталцоных нотных сшыткаў (іх ужо 10) папярэднічала амаль дваццацігадовая пошукава-даследчыцкая і папулярызатарская праца заснавальніка гэтай серыі выданняў — Яўгена Паплаўскага, кампазітара і вядомага руплівіцы адраджэння айчыннай музычнай спадчыны. Ён у свой час быў асістэнтам-стажорам Санкт-Пецярбургскай кансерваторыі і, зацікаўлены лёсам страчанай і забытай музыкі, што калісьці гучала на беларускіх землях, пачаў мэтанакіравана вывучаць фонды Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі. Працягваў сваю пошукава-папулярызатарскую дзейнасць, працуючы ў творчым аб'яднанні "Беларуская Капэла". Далучыўшыся да нешматлікіх даследчыкаў нашай музычнай даўніны, ён уводзіў у культурны досвед сучаснікаў адкрытыя нанова імёны, незнаёмыя творы... Затым былі першыя паспяховыя выдавецкія праекты, падтрыманыя Польскім інстытутам у Мінску. І яго колішні дырэктар, а цяпер дырэктар Польскага інстытута ў Санкт-Пецярбургу Цэзарый Карпіньскі, даведаўшыся пра новую ідэю дацэнта БДУКіМ Я. Паплаўскага, паспрыяў яе ўвасабленню.

Распачатая ў 2008 г. серыя выданняў мае на мэце пазнаёміць усіх зацікаўленых з музычнай культурай Рэчы Паспалітай XVII — XIX стст. Нягледзячы на парадоксы гісторыі, на крутыя павароты ў лёсах беларускага і польскага народаў, мы спрадвек жывём побач і ў нас ёсць галоўнае: крэўныя повязі, агульная і непадзельная культурная спадчына, даўнія духоўныя каштоўнасці, у якіх — нашы карані, досвед і адметнасць. Пра гэта нагадваюць і помнік культуры XVII — пачатку XVIII стст. "Давыдкаўскі ірмалагіён", і музыка Антона Абрамовіча, Канстанціна Горскага, Аляксандра і Міхала Ельскіх, Юзафа Ігнацыя і Каятана Крапэўскіх, Фларыяна Міладоўскага, Напалеона Орды... Выдадзеныя ноты нясуць і практычную карысць: скажам, зборнік твораў для фартэпіяна ў 4 рукі "Рытмы замкаў і сядзіб" прывабіць музыкантаў-прафесіяналаў і аматараў. Канцэрт-прэзентацыю ўпрыгожыла жывое гучанне музыкі ў выкананні знанага піяніста Ігара Алоўнікава, студэнтаў БДАМ і навучэнцаў каледжа пры ёй. У дар бібліятэцы Я. Паплаўскі перадаў нотныя выданні, прадстаўленыя на імпрэзе.

***На здымку:** дырэктар выдавецтва "Чатыры чвэрці" Ліліяна Анцух, намеснік дырэктара НББ Людміла Кірухіна, кампазітар і даследчык Яўген Паплаўскі, народны артыст Беларусі, прафесар Ігар Алоўнікаў.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ